Нацыянальная платформа

Форум грамадзянскай супольнасці

УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

24.02.2014

**Зварот Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства**

**« Аб салідарнасці з народам Украіны»**

У гэтыя дні, напоўненыя і горам, і радасцю, калі Ўкраіна перажывае пераломныя моманты сваёй найноўшай гісторыі, мы звяртаемся да ўсяго ўкраінскага народу з выказваннем салідарнасці і надзеі.

Разам з Украінай мы смуткуем па яе ахвярах, па героях, якія аддалі свае жыцці за агульначалавечыя каштоўнасці - свабоду, дэмакратыю, гуманізм і справядлівасць! Мы будзем памятаць пра іх.

Жыцці і здароўе людзей - гэта вельмі высокая цана, якую ўкраінскі народ заплаціў за сваю свабоду ад бязмежжа і бескантрольнасці ўлады. Гэтай крыві магло б не быць, але яна праліта не дарма. Няхай яна паслужыць урокам для тых, хто ўсё яшчэ лічыць, што такой цаной можна ўтрымацца ва ўладзе, што жыцці людзей можна аддаваць за прадметы раскошы і асабістыя амбіцыі.

Мы захапляемся гераізмам простых украінскіх грамадзян, іх пачуццём абавязку і адказнасці, самаарганізацыяй, самаадданасцю і воляй да перамогі. Без іх, звычайных мірных людзей, не здарылася б пераменаў.

Наперадзе Ўкраіну чакаюць нялёгкія месяцы ўладкавання краіны, вяртання да нармальнага жыцця, фармавання новых адносін паміж дзяржавай і грамадзянінам. Мы верым у тое, што наш добры сусед - народ Украіны - зможа выбудаваць сваю новую дзяржаву як сябра вялікай агульнаеўрапейскай сям'і, заснаванай на ідэалах гуманізму, на прынцыпах дэмакратыі. Украінскі народ заслужыў права будаваць гэтую дзяржаву сам, і тады карупцыі, злачыннасці, бяспраўю і прыгнёту людзей там не будзе месца.

Слава Украіне!

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (больш за 60 арганізацый)*